нования 60-летия советского кино Генеральный секретарь ЦК КПСС Л. И. Брежнев в приветствии советским кинематографистам подчеркнул огромное значение искусства, начало которому было положено подписанным Лениным 27 августа 1919 года Декретом о передаче кинодела в руки победившего народа: «Советское кино показало всему миру, что влияние и созидательная сила искусства многократно возрастают, когда оно участвует в общественной жизни страны, в борьбе за преобразование общества на основах социальной справедливости и подлинного гуманизма»[11]. Воплощая в жизнь ленинские идеи, Коммунистическая партия и советское государство создали все условия для развития киноиндустрии и кинотворчества.

[1] Луначарский о кино.— М., 1963, с. 19.
[2] Самое важное из всех искусств. Ленин о кино.— М., 1973, с. 116.
[3] Луначарский о кино, с. 113.
[4] Самое важное из всех искусств, с. 20.
[5] Там же, с. 32.
[6] Там же, с. 166.
[7] Там же, с. 163.
[8] Там же, с. 163.
[9] Там же, с. 164.
[10] Луначарский о кино, с. 69.
[11] Брежнев Л. И. Советским кинематографистам.— Советский экран, 1979, № 20, с. 1.

А. Г. СЛУКА

## БЕЛАРУСКІ ДРУК У БАРАЦЬБЕ ЗА КАМУНІСТЫЧНУЮ МАРАЛЬ

Комплексная праграма камуністычнага выхавання, абгрунтаваная XXV з'ездам КПСС, нацэлена ў будучыню. Яна разлічана на доўгатэрміновую перспектыву падрыхтоўкі людзей да выканання складаных сацыяльных функцый у справе пабудовы камунізму. Наступным крокам у распрацоўцы сучасных тэарэтычных праблем выхавання з'явілася пастанова ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы», у якой знайшлі сваё канцэнтрыраванае выражэнне самыя надзённыя праблемы ідэйнай загартоўкі чалавека на сучасным этапе развітога сацыялізму. У пастанове канкрэтна ўказана, што на аснове фарміравання ў савецкіх людзей устойлівага навуковага светапогляду, што з'яўляецца стрыжнем ідэалагічнай работы, патрэбна паўсюдна забяспечыць высокі навуковы ўзровень прапаганды, яе цесную сувязь з жыццём, з вырашэннем гаспадарчых і палітычных задач. У сувязі з гэтым партыя адводзіць вялікую ролю сродкам масавай інфармацыі — друку, радыё і тэлебачанню — у выкананні складаных выхаваўчых задач. Яны павінны, як указана ў пастанове ЦК КПСС, «дапамагаць савецкаму чалавеку добра арыентавацца ва ўнутраным жыцці і ў міжнародных падзеях, выклікаць імкненне ўнесці максімальны ўклад у агульную справу, у будаўніцтва камунізму»[1].

Рэспубліканскія газеты «Звязда», «Советская Белоруссия», «Сельская газета», «Чырвоная змена», «Знамя юности» і іншыя ўдзяляюць вялікую ўвагу пытанням выхавання асобы. У беларускім друку склалася пэўная сістэма распрацоўкі праблем суадносін чалавека і вытворчасці, чалавека і калектыву, а таксама комплексу паводзін асобы ў розных жыццёвых абставінах. Газетныя матэрыялы маральна-псіхалагічнага характару маюць свае адметныя рысы. Гэта ў цэлым глыбокае, удумлівае даследаванне канкрэтных паводзін асобы, вызначэнне тых матываў, якімі кіруецца чалавек ў сваёй дзейнасці, паказ таго складанага шляху, што вядзе «героя» да таго ці іншага дзеяння, і як пры гэтым аб'ектыўныя паводзіны і акалічнасці дамініруюць над выпадковасцю. Журналісты імкнуцца паказаць багаты маральны склад чалавека, раскрываюць высакароднасць, сумленнасць, прынцыповасць савецкіх людзей, праяўленне іх чалавекалюбства, высокай дысцыплінаванасці, устойлівасці перад уплывам буржуазнай ідэалогіі.

У той жа час газеты рэспублікі сістэматычна выкрываюць парушэнні маральнага кодэксу будаўніка камунізму, розныя адхіленні ад норм паводзін у сацыялістычным грамадстве: бюракратызм, разбазарванне дзяржаўнай маёмасці, хуліганства, п'янства, абыякавасць да працы, праяўлен-

не мяшчанства, легкадумных адносін да жыцця—усе антыподы камуністычнай маралі, што сустракаюцца ў нашы дні.

На старонках «Звязды» 27 ліпеня 1979 года надрукаваны матэрыял «Спелае жыта... на сілас», у якім гаворыцца аб выключнай па характару з'яве. У калгасе «Чырвоная зорка» Салігорскага раёна па загаду старшыні касілі амаль спелае жыта на сілас. Калгасу быў нанесены значны ўрон. Але гэта нешта большае, чым безгаспадарчасць. Тут дакладна праявіліся амаральныя паводзіны ўдзельнікаў гаспадарчага злачынства. Камбайнер палавіну дня касіў высокае жыта, наглядаў, як зерне сыпалася пад калёсы. «—Магчыма, цэнтнераў па 16 можна было б узяць»,—разважаў ён і зноў уразаўся камбайнам у падатлівую сцяну жыта. Толькі ў поўдзень закралася сумненне, што ён робіць ганебную справу. Тады камбайн спыніў свой злачынны ўкос. Неахайна паставіўся да справы аграном калгаса, якому было даручана на месцы, непасрэдна на полі, прыняць рашэнне—касіць ці не касіць. На справе атрымалася, што адказныя работнікі безадказна паставіліся да сваіх абавязкаў па зберажэнню народнага дабра. Больш таго, у той жа гаспадарцы звыш 60 т здробненага жыта было звалена ў яму разам з веццем лазы, лебядой і іншай травой. Як высветлілася, у такім выглядзе збажына была фактычна пушчана на згубу. Карэспандэнт грунтоўна даводзіць, што «героі» такіх ганебных спраў не маюць маральнага права займаць адказныя пасады; яны не забяспечваюць выкананне пэўных абавязкаў, а іх «дзейнасць» прыносіць шкоду.

Трэба адзначыць, што рэспубліканскія газеты вельмі скрупулёзна разглядаюць кожнае здарэнне або факт, якія трапляюць у поле зроку рэдакцыі, імкнуцца рашуча перакрыць шляхі безгаспадарчасці. Гэта ў поўнай меры адпавядае запатрабаванням часу. Там, дзе не цэняць грамадскі здабытак, паслаблены або адсутнічае строгі ўлік, можа прарасці злоўжыванне даверлівасцю людзей, ствараюцца ўмовы для парушэння маральнага кодэксу.

У. І. Ленін у свой час заклікаў журналістаў да палітычнай і гаспадарчай пільнасці. У артыкуле «Аб характары нашых газет» ён патрабаваў «ахоўваць інтарэсы рабочага **класа** ад тых жменек, груп, слаёў рабочых, якія ўпорна трымаюцца традыцый (прывычак) капіталізма і прадаўжаюць глядзець на Савецкую дзяржаву па-ранейшаму: даць «ёй» работы менш і горш,—сарваць з «яе» грошай больш» [2]. Ленінскі вывад надзённа гучыць і цяпер, калі эканамічны патэнцыял нашай дзяржавы дасягнуў узроўню самых развітых капіталістычных краін, а па шматлікіх паказчыках і праўзыходзіць іх. Маральны абавязак кожнага чалавека, у якой бы сферы матэрыяльнай вытворчасці ён ні быў заняты, зберагаць і мацаваць грамадскую маёмасць. Рэспубліканскія газеты штодзённа пішуць аб людзях, якія плённа працуюць на вытворчасці, імкнуцца ўзбагаціць грамадскі здабытак. «Советская Белоруссия» у карэспандэнцыі «Урокі Наталлі Кунскай» расказала аб жанчыне, загадчыцы малочна-таварнай фермы, пад кіраўніцтвам якой за няпоўных дзесяць гадоў ферма была ператворана ў сучаснае прадпрыемства па вытворчасці малака і мяса. І ўсё гэта было зроблена ў асноўным рукамі жанчын-даярак, якія на працягу многіх год адбіралі лепшых жывёл, вывучалі тэхналогію іх догляду і дасягнулі высокіх паказчыкаў у вытворчасці малака. Журналісты рэспубліканскіх газет праз такія факты паказваюць сапраўднае маральнае аблічча савецкіх людзей, для якіх праца стала сэнсам жыцця і вымяраецца грамадзянскай адказнасцю. Загадчыца фермы ў сваёй рабоце па аб'яднанню калектыву не замыкалася толькі на вытворчых паказчыках. Яе ў роўнай меры цікавіла і асабістае жыццё кожнага працаўніка. Жанчыны жылі дружна. Турботы і клопаты, а здаралася, і бяда ў адной сям'і знаходзілі шчыры водгук у сэрцах усіх. Кожны работнік глыбока ўсвядоміў простую, але важную акалічнасць, што ад яго старання і ўмення залежыць поспех усяго калектыву і яго асабісты. У такой дысцыплінаванасці паводзін людзей, свядомай і добраахвотнай супадпарадкаванасці агульным інтарэсам—асноўная сіла працоўнага калектыву. Як правіла, у такіх калектывах амаль поўнасцю знішчаны ўмовы для амаральных праяў. Асабістыя і грамадскія інтарэсы людзей у такіх калектывах аб'ектыўна спалучаюцца.

Настойлівая праца рэдакцый рэспубліканскіх газет па выкараненню антыподаў камуністычнай маралі прыносіць вялікую карысць. Але час патрабуе ад сродкаў масавай інфармацыі новай якасці гэтай працы, пошуку больш грунтоўных форм і метадаў, адказу ад ілюстрацыйнасці і сенсацыйнасці. Адзначаючы значныя станоўчыя поспехі газет рэспублікі ў справе

прафілактыкі амаральных праяў, трэба заўважыць, што не ўсе матэрыялы рэспубліканскіх газет, накіраваныя супраць антыподаў камуністычнай маралі, дасягаюць сваёй мэты. Часта іх аўтары захапляюцца дэтэктыўным сюжэтам, сканцэнтроўваюць сваю ўвагу не на асноўных прычынах, а на «фарбах» следства, забываюцца паказаць прамых віноўнікаў і іх супольнікаў, а ўказваюць на пабочныя факты і акалічнасці.

Эфектыўнасць прапаганды, накіраванай супраць антыподаў камуністычнай маралі, у першую чаргу характарызуецца тым, наколькі інтэнсіўна выступаюць газеты супраць той ці іншай амаральнай праявы, як трапна выкрываюць журналісты антыграмадскія паводзіны асобных людзей. Так, газета «Звязда» у артыкуле «Крыштальная павуціна» расказала аб тым, як настаўніца зрабілася спекулянткай [4]. Грошы для яе ператварыліся ў сэнс жыцця, пазбавілі разумення маральных законаў нашага грамадства і давялі да лавы падсудных. Яе муж і сын сталі саўдзельнікамі маральнага самагубства. Такія матэрыялы моцна ўплываюць на свядомасць чытача. Яны скіроўваюць чалавека да роздуму, фарміруюць у яго свядомасці ўстойлівы імунітэт супраць адхіленняў ад норм маральных паводзін.

Вядома, што публіцыстычнае выступленне моцна не толькі глыбінёй даследавання праблемы, але і шырынёй абагульненняў і вывадаў. У многіх матэрыялах, якія сустракае чытач на газетнай старонцы, сацыяльныя вывады або адсутнічаюць, або вельмі слабыя і не кранаюць свядомасць чалавека. Журналісты як быццам саромеюцца «предъявить счет» тым, хто несумненна парушае нашы маральныя законы. Такія матэрыялы больш падобны на халастыя стрэлы. Яны не ўзбуджаюць актыўнай дзейнасці, грамадзянскага пратэсту ў чытача. «Сельская газета» паведаміла, што сакратар выканкома сельскага савета ў Клічаўскім раёне на працягу некалькіх год абманам атрымоўваў зарплату за прыбіральшчыцу, жанчыну, маці пяцярых дзяцей [5]. Факт непрыемны. Але калі газета выступіла, патрэбна расказаць, як гэта здарылася. Чаму гэтага не заўважылі члены выканкома, старшыня сельскага савета, партыйныя і савецкія органы? Нічога гэтага ў матэрыяле няма, а журналіст прыводзіць неапраўданыя выразы «як бы гэта мягчэй выказацца». Прывычка журналіста гаварыць у паўголаса, калі ён звяртаецца да шырокай аўдыторыі чытачоў, вельмі шкодная. У. І. Ленін, абмяркоўваючы задачы часопіса «Под знаменем марксизма» у артыкуле «Аб значэнні ваяўнічага матэрыялізма» указваў, што ў баявым органе павінна абавязкова прысутнічаць «бойкая, жывая, таленавітая, востра і адкрыта нападаючая... публіцыстыка...»[6]

Гэты ленінскі вывад, пацверджаны ўсёй гісторыяй развіцця савецкага друку, набывае сучаснае гучанне. Рэдакцыі газет павінны ўсямерна выкарыстоўваць вострую зброю партыйнай публіцыстыкі ў справе сцверджання камуністычнай ідэйнасці ў свядомасці савецкіх людзей і весці паўсядзённую знішчальную крытыку антыподаў камуністычнай маралі.

[1] Звязда, 1979, 6 мая.
[2] Ленін У. І. Творы, т. 28, с. 80.
[3] Советская Белоруссия, 1979, 4 октября.
[4] Звязда, 1979, 19 жніўня.
[5] Сельская газета, 1979, 13 июля.
[6] Ленін У. І. Творы, т. 33, с. 204.